**УДК 72.05:296.735(476.6)**

# СТАРАДАЎНІЯ СЯДЗІБЫ АСТРАВЕЧЧЫНЫ: ГІСТОРЫЯ, АРХІТЭКТУРА, УЛАДАЛЬНІКІ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

*Разглядаецца дойлідства мінулага, якое дае нам магчымасць далучыцца да гістарычных пакаленняў, пазнаць жыццё грамадства з няменшай дакладнасцю і разуменнем, чым па літаратурных крыніцах. Паказаны старадаўнія сядзібы, якія захаваліся да нашых дзён і з'яўляюцца каштоўнымі сведкамі мінулага.*

На тэрыторыі Астравецкага раёна існавала вялікая колькасць сяздіб, але да нашых дзен захавалася няшмат. Выразным прадстаўніком з'яўляецца сядзіба ў Трокеніках. Першае ўпамінанне Трокенікаў (Трокінік) сустракаецца ў актах Літоўскай метрыкі за 1503 год. Рэнесансная сядзіба ў маёнтку існавала ў 1602 годзе. Маёнтак у гэты час належаў Крыштофу Зяновічу, ваяводзе берасцейскаму, з 1797 года – маршалку Чыжу.

У 1892 годзе Трокенікамі валодаў род Шышкаў, з якога выйшаў вядомы мастак Мар'ян Богуш-Шышка. У двары жыло 9, у фальварку – 35 рэвізскіх душ. Двор займае высокі ўзгорак з плоскай вяршыняй, які крута абрываецца з паўночнага боку да русла невялікага ручая, прытока Віліі. Асаблівасці рэльефу вызначылі планіровачную структуру сядзібы, сфарміраванай у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя. Яна невялікая, кампактная. Парадная частка мае сіметрычна-восевую пландроўку. Уздоўж цэнтральнай восі праходзіць уязная алея. Партэр параўнальна вялікі з традыцыйным пад'язным кругам, на якім у 1967 годзе пастаўлены абеліск на ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яго абкружаюць высокія клёны і ліпы. Вось кампазіцыі завяршаецца сядзібным домам (мал. 1), пабудаваным у пачатку XX стагоддзя ў стылі неабарока.



Мал. 1. Сядзібны дом Шышкаў у Трокеніках

Будынак аднапавярховы, мураваны, прамавугольны ў плане з мансардай. Мае высокі дах з «заломамі». Над галоўным уваходам і на тарцах – фігурныя ўвагнута-выпуклыя франтоны. Вітая металічная лесвіца вядзе на мансардавы паверх, які мае выхад на балкон.

Парадны двор з правага боку падкрэслены двухпавярховым жылым флігелем, з процілеглага боку – гаспадарчым будынкам. Добра захаваўся трэці будынак – стайня, якая знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім вуглу двара. Яна Г-падобная ў плане, пабудавана ў 1879 годзе з валуноў і камення. Праёмы вакон і дзвярэй, карніз і вуглы выкладзены светла-чырвонай цэглай. Вокны лучковыя і паўцыркульныя. Сцены вылучаюцца прафесійнай кладкай, прыгожай структурай малюнка, які ўтварае вялікае каменне на фоне вапнавага раствору з «разынкай».

Да параднага двара прымыкае невялікі парк, у аснову планіроўкі якога пакладзены дзве ўзаемна-перпендыкулярныя алеі. Яны выводзілі да грэбня крутой тэрасы і заканчваліся відавымі пляцоўкамі. З іх адкрываюцца жывапісныя краявіды, бліжні план якіх складаў ручай са ставам (зараз спушчаны). Адна з алей ліпавая, вузкая (шырыня 4 м), другая – з конскага каштана звычайнага, больш шырокая (шырыня 5 м) і доўгая. З бакоў двор абкружалі пладовыя сады. На месцы ўсходняй часткі сада размясцілася сядзіба базавай агульнаадукацыйнай школы.

Да ліку найбольш старых сядзіб, якія часткова захаваліся, адносіцца Двор Міхалішкі і сядзіба часоў позняга барока ў вёсцы Усвяцце, дзе захаваўся фрагмент баскета былога рэгулярнага парку з садам (плошча каля 1 га). Ліпы ва ўзросце больш за 200 гадоў у лінейных пасадках дасягаюць вышыні 21–28 м з дыяметрам ствалоў больш за 1 м.

Міхалішкі ў пісьмовых крыніцах вядомы з канца XV стагоддзя як уладанне князёў Радзівілаў, потым Пронскіх і Кенішкаў. У 1604 годзе куплены Янам Цыпрыянам Бжастоўскім, які ў 1622 годзе фундаваў кляштар аўгусцінцаў. У 1653 годзе яго сын Цыпрыян Павел, рэферэндар Вялікага Княства Літоўскага, вядомы дыпламат, па праекту архітэктара К. Пенса пабудаваў касцёл св. Міхаіла Арханёла ў стылі сталага барока. У падзямеллі храма спачывае род Бжастоўскіх.

Бжастоўскія прыкладна ў гэты час таксама ў стылі барока заснавалі каля вёскі новы двор, які многім пакаленням служыў галоўнай рэзідэнцыяй роду. Двор уключаў сядзібны двухпавярховы дом, парк на тэрасах, сажалку з каналам і гаспадарчыя пабудовы. Сядзібны дом у 1812 годзе страціў другі паверх і дэкор, але захаваўся да нашых дзён. Будынак прамавугольны ў плане (24×19 м), стаіць на высокіх паўцыркульных і крыжовых скляпеннях, вылучаецца таўшчынёй сцен (0,9 м), кладкай і інтэр’ернай планіроўкай. У сценах захаваліся нішы былых камінаў.

Прыкладна ў сярэдзіне XIX стагоддзя новымі гаспадарамі Котвічамі быў пабудаваны лямус – двухпавярховы будынак (10×10×10), першы паверх якога перакрыты крыжовымі скляпеннямі. На былым гаспадарчым двары захаваўся будынак часоў Ксаверыя Янавіча Котвіча, узведзены з вялікіх цэльных і колатых камянёў. Бакавыя фасады, вуглы будынка ўпрыгожаны дэкаратыўнымі ўстаўкамі з чырвонай цэглы.

Другім выразным прыкладам, звязаным з імем Бжастоўскіх, з’яўляюцца Дубнікі. Спачатку яны ўваходзілі ў склад Варнянскага ключа, што належаў Абрамовічам. Потым Дубнікі перайшлі да Коцелаў, пазней – да Бжастоўскіх [1]. У пачатку XIX стагоддзя маёнткам валодаў Тамаш Мінейка, земскі пісар, ковенскі ротмістр, пасол на Чатырохгадовы Сойм 1788–1792 гадоў. Пасля яго Дубнікамі валодалі чатыры пакаленні роду Мінейкаў, з якімі сваяцкімі адносінамі быў звязаны польскі пісьменнік Генрык Сянкевіч. У 1880-я гады ён працаваў у маёнтку над раманам «Пан Валадыёўскі», выношваў задуму рамана «Патоп». Сваякі і жыхары Дубнікаў з’яўляліся прататыпамі герояў яго твораў.

Спачатку Мінейкі жылі ў драўляным палацы XVII стагоддзя, пабудаваным, відаць, яшчэ Абрамовічамі. У 1878 годзе Браніслаў Мінейка пабудаваў у эклектычных формах новы палац па праекту інжынера Вапніцкага з Пецярбурга. Будынак складанай канфігурацыі ў некалькі змененым выглядзе дайшоў да нашых дзён. Ён двухпавярховы з аднапавярховымі бакавымі аб’ёмамі. Першы паверх мураваны, другі – драўляны. Усходні фасад палаца мае 2 рызаліты. Левы з іх завершаны атыкам, дзе ёсць дата будаўніцтва, а над ёю размяшчаўся высечаны з дрэва гербавы шчыт. Другі рызаліт мае зрэзаныя вуглы, чым нагадвае эркер, і завершаны конусападобным дахам. Маляўнічы выгляд будынку надавала квадратная ў плане двухпавярховая вежа з вокнамі і балконам.

Палац меў шмат пакояў рознай формы і прызначэння: вестыбюль, вялікі і малы салоны, бібліятэку, сталовую, гасціныя, будуар, кабінет, буфет, аптэку, пакоі жылыя, службовыя, гардэроб і інш. Мінейкі валодалі вялікімі мастацкімі і фамільнымі каштоўнасцямі. Пакоі мелі паркет, выкладзены ўзорамі, дэкаратыўную ляпніну, кафляныя печы, каміны. У малым салоне і будуары каміны былі мармуровыя. У найбольш рэпрэзентатыўных пакоях паркет быў усланы персідскімі дыванамі, са столі звісалі хрустальныя люстры, сцены ўпрыгожвалі бра і вялікія люстры. Мэбля ў палац была завезена з Пецярбурга. У малым салоне і будуары мэбля была абцягнута шаўковай тканінай.

Фамільныя партрэты, а таксама рыцарскія даспехі размяшчаліся ў кабінеце ўладальніка. Асобую каштоўнасць мелі збор старадаўняга серабра (сервізы, бакалы, чаркі), калекцыя хрусталя XVIII стагоддзя (чаркі, бакалы, у тым ліку дэкаратыўныя, вазы і інш.). У палацы былі бібліятэка (кнігі ў асноўным на польскай і французскай мовах) і фамільны архіў.

Палац стаяў сярод пейзажнага парку плошчай каля 10 га. Яго залажыла Анелія з Шабуневічаў, жонка Міхала Мінейкі, яшчэ да ўзвядзення новага палаца. Захаваліся невялікія фрагменты дрэвастою, вадаём з востравам, а таксама часткова – уязныя алеі (ліпавая, бярозавая і кляновая).

Гаспадарчыя пабудовы страчаны, акрамя невялікай лядоўні, складзенай з бутавага каменя.

Паводле дакументаў, у 1810 годзе быў пабудаваны сядзібны дом у невялікім маёнтку Янікаўскіх Каценавічы і закладзена новая сядзіба ў простых утылітарных формах. Дом захаваўся [2, ст. 498]. Ён

невялікі (25×12 м), драўляны, з ганкам, які мае 2 пары калон. У доме былі 4 прыгожыя кафляныя печы, з якіх захавалася адна з дэкаратыўным фрызам і медальёнам. З двух бакоў газона з пад'язным кругам стаялі свіран і афіцына. Парк спланаваны па тыпу эканамічнага саду і прадстаўлены адным баскетам. Добра захавалася паўночная ліпавая алея, дрэвы ў якой самкнуліся кронамі, утвараючы зялёны купал. Да параднага двара вядзе ўязная вязавая алея. З гаспадарчых пабудоў збярогся толькі невялікі драўляны свіран з навесам.

Самай значнай і шырока вядомай у раёне была сядзіба ў Варнянах. У XV стагоддзі мясцовасць называлася Касакоўшчызна або Сільвестраўшчызна і належала Сангайлам. У 1462 годзе Марыяна Сангайла заснавала тут касцёл і пабудавала дом прыходскага святара. У XVI стагоддзі ўласнікі часта мяняліся. У 1503 годзе Варнянамі валодалі князі Пятковічы. Адпаведна дакументу за 1507 год князь Глеб Пронскі страціў варнянскі маёнтак. У 1511 годзе пацверджэнне на валоданне маёнткам атрымалі князі Пётр і Андрэй Свірскія, Рыгор Станіслававіч Осцік. У 1522 годзе маёнтак належаў Марыне Войцехавай Чыжовай. У 1567 годзе сярод уласнікаў Варнян былі Станіслаў і Павел Чыжы. У 1581 годзе Варняны адышлі Абрамовічам і належалі гэтаму роду амаль 3 стагоддзі – да 1867 года.

У актах за 1596 год, што тычацца г. Вільня, называецца «Ян Абрамовіч на Варнянах, воевода Смоленскій, ... староста Лідскій і Венденьскій...». Ян выхоўваўся пры двары Мікалая Радзівіла Рыжага, удзельнічаў у многіх ваенных паходах, з'яўляўся вядомым дзеячам-кальвіністам, вылучаўся адукаванасцю, друкаваўся сам, выдаў за свой кошт кальвініцкі «Катэхізіс» і іншыя кнігі. У Варнянах пабудаваў кальвініцкі збор, шпіталь і школу, якія існавалі да сярэдзіны XVII стагоддзя. Традыцыі бацькі працягваў Мікалай (яму ў пачатку XVII стагоддзя адышоў Варнянскі ключ), прыхільнік кальвінізму, ваявода мсціслаўскі і трокскі, генерал літоўскай артылерыі. Пазней Варняны належалі Самуэлю, сыну Мікалая. Пасля смерці бацькі ён перайшоў у каталіцтва і закрыў дзедаў кальвініцкі збор.

Наступнымі ўладальнікамі Варнян былі сын Самуэля, таксама Самуэль, а потым яго сыны. З іх найбольш вядомы Юрый (Ежы), падваявода віленскі, падчашы віленскі, стараста старадубскі. Быў жанаты на Марцыяне з Дзерналовічаў, якая пакінула значны след у развіцці Варнян. У 1760 годзе яна пачала будаўніцтва варнянскага касцёла, а на месцы старой сядзібы Абрамовічаў заснавала новую рэзідэнцыю. Яе сын Яўхім у 1785 годзе набыў у Сангушкаў Дабраўлянскі ключ, пасля смерці маці яму адышлі бацькоўскія Варняны, а старэйшаму брату Андрэю, ротмістру кавалерыі Вялікага Княства Літоўскага – Дабраўляны.

Пасля Яўхіма Варняны належалі яго сынам Мікалаю і Ігнацію. Апошні прадаў Дабраўляны, не меў сына і на ім абарвалася галіна роду [3].

Пасля Абрамовічаў Варнянамі валодаў Андрэй Снядэцкі, унук Андрэя Снядэцкага, вядомага хіміка, урача, філосафа і асветніка, а пасля яго – дачка Марыя Антаніна. Апошнімі ўладальнікамі былі Мілашы, а з 1914 года – Зыгмунт Хамінскі, які ў хуткім часе правёў парцэляцыю маёнтка.

У другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя сядзіба ў Варнянах лічылася адной з найпрыгажэйшых на Віленшчыне. Яна з'яўлялася часткай так званага «ўзорнага» Варнянскага палацава-гарадскога архітэктурнага ансамбля, закладзенага Марцыянай Абрамовіч у другой палове XVIII стагоддзя па праекту архітэктара А. Касакоўскага ў стылі позняга барока. Ён уключаў касцёл св. Георгія, плябанію і дом аптэкара, палацава-паркавы ансамбль, гасцініцу, карчму і 16 тыповых аднапавярховых жылых дамоў (захавалася 6).

Усе элементы ансамбля аб'яднаны адзінай кампазіцыйнай ідэяй і атрымалі агульнае стылявое вырашэнне. Дамінантай ансабля з'яўляецца Георгіеўскі касцёл, які замыкае плошчу з усходняга боку. Дом аптэкара і плябанія ўтвараюць перад храмам курданер. На процілеглым заходнім баку вось замыкае палацава-паркавы ансамбль.

Уяўленне пра палац (мал. 2) і ансамбль наогул даюць 4 унікальныя літаграфіі 1820-х гадоў, якія знаходзяцца ў зборах Нацыянальнага музея ў Варшаве, малюнкі Н. Орды і іншых аўтараў. Палац быў драўляны, двухпавярховы, з двума кароткімі крыламі з ганкамі, якія вялі ў парк, на від суровы і без значнага дэкору. На працягу XIX стагоддзя некалькі разоў падвяргаўся рэканструкцыі, таму яго выгляд на малюнку 1900 года значна адрозніваецца ад выявы на літаграфіях.

Сіметрычна з двух бакоў палаца стаялі 2 сціплыя драўляныя афіцыны. Паміж імі і палацам быў вялікі газон з кругам у цэнтры, навокал раслі клёны, ліпы, ясені, елкі, адзінкавыя дрэвы лістоўніцы еўрапейскай, сасны веймутавай, якія часткова захаваліся і дапамагаюць высветліць месца параднага двара. Ён аддзяляўся ад плошчы ў мястэчку, якая служыла рынкам, узорнай металічнай агароджай на бутавым фундаменце з уязной брамай. Брама бачна на адной з літаграфій. Месца яе добра прасочваецца. Яна складалася з двух прамавугольных пілонаў, якія мелі пешаходпыя праходы, завершаныя вазамі. Ад касцёла да брамы вяла ліпавая алея, а ад брамы да палаца – шырокая (12 м) кляновая алея (захавалася 11 дрэў).

Сціплы знешні выгляд палаца быў кампенсаваны стылёвым унутраным убраннем. У аздабленні сцен пакояў Канстанцінам Отасельскім, мастаком з вялікім густам, выкарыстоўваліся самыя лепшыя фарбы, пазалота, лак, тканіна. Сцены пакояў былі абцягнуты тканінай, часткова пакрыты драўлянымі

панэлямі, столь мела багатую ляпніну і насценны жывапіс, вокны і дзверы былі лакіраваны ў белы і залаты колер. Мэбля пакояў адпавядала часу эпохі і была ў асноўным у стылі Людовіка XVI.

Пры Снядэцкіх палац звонку і ўнутры зведаў значную рэканструкцыю. Ён быў абшаляваны, у цэнтральнай частцы будынка былі надбудаваны люкарны з двухсхільнымі дахамі, новае абрамленне атрымалі вокны, бакавыя крылы, што адлюстравана на адным з фотаздымкаў каля 1900 года. Пакоі абстаўляюцца новай мэбляй, палац папаўняецца новымі творамі мастацтва і фамільнымі каштоўнасцямі.



Мал. 2. Палац у вёсцы Варняны. Паркавы фасад (Н. Орда)

За палацам размяшчаўся парк. Аснову кампазіцыі яго складаў вялікі вадаём з востравам, да якога вёў перакідны мосцік. Вадаём з’яўляецца часткай складанай воднай сістэмы з 26 вадаёмаў – адной з найбуйнейшых сярод сядзіб Беларусі (каля 65 га). Водная паверхня з архітэктурнымі акцэнтамі (млынам, броварам, павільёнам-купальняй, альтанкай з калонамі, неагатычнай вежай на востраве, пабудаванай пазней з чырвонай цэглы ў выглядзе крапасных збудаванняў сярэднявечча), дамбы, мосцікі, каналы складалі своеасаблівасць парка, надзялялі яго рамантычнымі матывамі.

Водная сістэма заснавана на ручаі Хварасцянка, выток якога пачынаецца з балотнага масіву каля вёскі Карняны. Цягнецца сістэма амаль да вёскі Больнікі. Вадаёмы маюць свае найменні. Так, вадаём з востравам называецца «млыновым». Ён вялікі, найбольш дэкаратыўны, кампазіцыйна звязаны з ансамблем. У сістэме ёсць вадаёмы «крынічны», «травяны» і іншыя. Вялікі вуглавы вадаём называецца «чацвёркай». Вада з сістэмы падаецца ў 4 ставы, зробленыя ў пойме Газянкі, прытока Віліі.

На другой восі сядзібы знаходзіцца алея, якая ад параднага двара вядзе ў былы гаспадарчы двор. Захаваліся 4 будынкі. Уздоўж алеі стаяць белы атынкаваны будынак свірна і маленькая лядоўня.

У 1997–1998 гадах адноўлены былы млын, а таксама невялікі будынак з паўцыркульнымі вокнамі каля вадаёма, пабудаваны з палявога каменя з устаўкамі разынак.

Помнікі дойлідства – гэта яскравыя сведкі айчыннай гісторыі, увасабленне таленту беларускага народа, сапраўдныя рубяжы нашай гістарычнай памяці, за якія адступаць нельга. Гэта наша бязмернае багацце, непаўторная спадчына, якую мы павінны вывучаць, ведаць і шанаваць.

ЛІТАРАТУРА

5. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 498 с.
6. Нальшчан, Т. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны – Варняны [Электронны рэсурс] / Т. Нальшчан. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=87&Itemid=38. – Дата доступу: 14.09.2015.
7. Нальшчан, Т. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны – Дубнікі [Электронны рэсурс] / Т. Нальшчан. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=322&Itemid=38. – Дата доступу: 09.09.2015.